# ХАТНІ ВЯСКОВЫ ПОСУД

*Максімчук У.А., Ісанаў Г.С.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Сугака Н.А. – канд. гіст. навук, дацэнт*

Беларусы разам з рускімі і ўкраінцамі належаць да ўсходніх славян. Генетычная роднасць, агульнасць гістарычнага лёсу, пастаянныя міжэтнічныя сувязі, падобнасць прыродных умоў, у якіх развіваліся народы, прывялі да выпрацоўкі блізкіх формаў вытворчага, грамадскага і сямейнага побыту, матэрыяльнай і духоўнай культуры, традыцый і звычаяў. І тым не менш мы – беларусы! Таму прапануем зрабіць крок у краязнаўства, беларусазнаўства.

Адным з праяўленняў матэрыяльнай культуры беларускага народа з'яўляецца хатні вясковы посуд. Сёння ёсць магчымасць даведацца пра класіфікацыю посуду, назвы посуду і яго прымяненне, а таксама назвы посуду ў фальклоры і творах мастацкай літаратуры. Зацікавіўшыся гэтай тэмай, вывучаючы яе, мы імкнуліся паглыбіць свае веды, папоўніць свой слоўнікавы запас, даведацца пра асноўныя віды вясковага посуду, яго назвы і прымяненне.

Хатні посуд – гэта прадметы бытавога, гаспадарчага прызначэння для прадуктаў харчавання, страў, вадкасцей. Прымяненне ганчарнага круга і такарнага станка дало магчымасць наладзіць масавую рамесніцкую вытворчасць глінянага і драўлянага посуду, які вызначаўся дасканалымі, адточанымі формамі. Набыў пашырэнне выдзеўбаны, бандарны, плецены посуд. У народным побыце ў шырокім ужытку быў самаробны посуд з дрэва, гліны, кары, лубу, бярosты і іншых простых і даступных матэрыялаў. Багаты асартымент вырабаў гаспадарчага прызначэння (гаршкі, збанкі, гладышы, слоікі, спарышы, глякі, міскі, талеркі) уключаў ганчарны посуд. Посуд рознага прызначэння і ёмістасці вырабляўся з дрэва. У залежнасці ад тэхналогіі ён падзяляўся на бандарныя вырабы (кадушкі, дзежкі, бочкі, цэбры, вёдры, даёнкі), выдзеўбаны посуд (начоўкі, карцы, міскі), такарны (сальніцы, ступкі, міскі).

У XIX стагоддзі ў сувязі з сацыяльна – эканамічнымі зменамі ў народным побыце посуд узбагаціўся прыёмамі і сродкамі аздаблення. У народным побыце пашыраюцца гліняныя вазы, цукарніцы, масляніцы, сальніцы з роспісам і ляпнінаю, драўляныя талеркі з разьбою. У наш час сфера прымянення самаробнага посуду ўтылітарнага прызначэння звужаецца. У шырокі ўжытак уваходзяць больш зручныя, танныя, гігіенічныя шкляныя, металічныя, пластмасавыя, фарфоравыя вырабы прамысловай вытворчасці. Характар, форма і дэкор традыцыйнага посуду выкарыстоўваюць для стварэння ўтылітарнага, мастацкага і сувенірнага прызначэння. Плеценыя з саломы і лазы цукерачніцы, латкі, падносы, кошыкі, драўляныя чарпакі, лыжкі, наборы для спецый з разьбой і размалёўкай, гліняныя кубкі, вазы, наборы для квасу, вады, малака ў характэрным нацыянальным стылі вырабляюць прадпрыемствы мастацкай прамысловасці і майстры традыцыйных народных мастацкіх промыслаў.

Сярод найбольш распаўсюджаных відаў посуду таго часу можна вылучыць апалонік, дзяжу, збан, гарлач, міску, букетнік, цэбар і іншыя. Апалонік (палонік) вялікая драўляная лыжка, якой разліваюць страву. Вырабляюць з мяккіх парод дрэва, мае зграбную форму, зручны ў карыстанні. Дзяжа (дзежка), пасудзіна для заквашвання цеста, ранейшая назва – квашня. Мела форму звужанай кверху шырокай бочачкі. Збан – гліняная пасудзіна для захоўвання малака і іншых вадкіх прадуктаў. Рабілі з выцягнутым тулавам, пукатымі бакамі, звужаным горлам, дзюбкай і вушкам – ручкай. Гарлач – гліняная пасудзіна для захоўвання малака і малочных прадуктаў. У пісьмовых крыніцах старажытнарускага часу вядомы пад назвай "кринь". Букетнікам называлі гліняную пасудзіну для кветак, ранейшая назва – кветнік. Традыцыйным ганчарным вырабам была міска. Адна са старажытных формаў керамічнага посуду, вядомага на тэрыторыі Беларусі з бронзавага веку. Лыжка прадмет сталовага прыбора. Бываюць драўляныя, металічныя, касцяныя; маюць круглы ці авальны чарпачок і ручку – дзяржанне. Цэбар – драўляны гаспадарчы посуд з клёпак (кляновых, ліпавых, дубовых, асінавых, бярозавых). У цэбры замешвалі сечку, рабілі "паранку" (сечку залівалі кіпнем) карове ці каню. Спарышы ганчарны выраб; гліняная пасудзіна з двух ці трох гаршкоў (зрэдку і сальніцы) аднолькавага ці рознага памеру, змацаваных ручкай. Кош – плеценая ёмістасць розных памераў для захоўвання і транспарціроўкі сыпкіх штучных рэчываў, пераважна харчовых прадуктаў. Конаўка гэта невялікая драўляная (з клёпак ці выдзеўбаная), радзей металічная або ганчарная пасудзіна з ручкай. Звычайна мела конусападобную форму. Кораб – ёмістасць для захоўвання і пераноскі сыпучых прадуктаў (збожжа, мукі, круп, гароху і інш.), сплеценая з лубу, саломы, лазы. Коўш – драўляная выдзеўбаная пасудзіна для перасыпання збожжа, мукі. Коўш называюць таксама чарпаком и многія другія прадстаўнікі.

Такім чынам, у народным побыце ў шырокім ужытку быў самаробны посуд з дрэва, гліны, кары, лубу, бяросты і іншых простых і даступных матэрыялаў. Хоць у наш час сфера прымянення

самаробнага посуду ўтылітарнага прызначэння звужаецца, але старадаўняе мастацтва жыве і сёння. Людзі купляюуь посуд. Гэта вельмі добрыя экалагічныя вырабы і вельмі прыгожыя. Яны нагадваюць аб сувязі людзей з нашай гісторыяй.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Аксамітаў, А. Прыказкі і прымаўкі. Тлумачальны слоўнік беларускіх прыказак і прымавак з архіваў, катэдральных збораў, рэдкіх выданняў XIX-XX ст. / А. Аксамітаў – Мінск. Беларуская навука. – 2000 – 320 с.*

*2. Валодзіна, Т.В. Без прыказкі і з лаўкі не зваліцца: свет рэчаў сялян / Валодзіна Т.В. – Мінск, Народная асвета. – 2003 – 193 с.*

*3. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мінск, Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. – 1989 – 575 с.*